Зоя ПАДЛІПСКАЯ, галоўны рэдактар часопіса «Роднае слова»:

«ШАНУЮЧЫ РОДНАЕ СЛОВА — ДБАЕМ ПРА БУДУЧЫНЮ»

Зоя Падліпская — член праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтар паэтычных зборнікаў «Палон нябёсаў», «У вэлюме завей», шэрагу публіцыстычных артыкулаў, навуковых матэрыялаў па пытаннях сучаснай беларускай паэзіі.

Працы ў рэдакцыі часопіса «Роднае слова» папярэднічалі шматлікія жыццёвыя дарогі, і ўсе яны былі асвечаны павагай да роднай мовы, настаўніцкай прафесіі, шчырасцю да кожнага, з кім даводзілася супрацоўнічаць.

Пазнаёміўшыся з Зояй Іванаўнай, яшчэ раз пераконваешся, што чалавека, як і дрэва, трымаюць на свеце карані, а яшчэ — любоў да той справы, якой прысвечана жыццё...

— Зоя Іванаўна, калі адбылося ваша знаёмства з часопісам «Роднае слова»?

— Часопіс «Роднае слова» суправаджае мяне па жыцці яшчэ з той пары, калі ў жніўні 1990 года я прыйшла ў школу выкладаць беларускую мову і літаратуру. Хутка я стала адным з аўтараў гэтага выдання (зараз думаецца, што зусім не выпадкова). З таго часу «Роднае слова» для мяне — дарадца і памочнік. Да гэтай пары ў хатняй бібліятэцы захоўваюцца амаль усе экзэмпляры за дваццаць гадоў. Пэўна, так было прадвызначана лёсам, што мне давялося стаць галоўным рэдактарам дарагога майму сэрцу выдання, каб разам з калектывам сапраўдных прафесіяналаў раздзяліць радасць творчай працы, вялікую адказнасць і клопат за далейшы лёс часопіса.

— Ці не ўзнікае жадання зноў вярнуцца ў школу?

— А я яе ніколі і не пакідала. Мяняецца толькі ўдзел у адукацыйным працэсе: настаўнік, метадыст, навуковы супрацоўнік НІА, прарэктар па вучэбнай рабоце, галоўны інспектар Міністэрства адукацыі, і вось зараз — галоўны рэдактар навуковага і метадычнага выдання. Кожная з гэтых пасад дазваляла мне рознабакова ўдзельнічаць у жыцці школы. Мы, «роднасловаўцы», і зараз частыя госці ў агульнаадукацыйных установах краіны.

— На ваш погляд, чым адметны часопіс «Роднае слова» ў інфармацыйнай прасторы беларускіх СМІ?

— «Роднае слова» як знакавае выданне філалагічнага і культуралагічнага плана вядома не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. У студзені 2013 года нам спаўняецца 25 гадоў. За гэты час выбудавана канцэпцыя часопіса, захаваны і зберагаюцца лепшыя традыцыі, ідзе пастаянная праца над удасканаленнем зместу. Зараз у часопісе вызначана пяць раздзелаў: «Літаратура і час», «Мовы рысы непаўторныя», «Нацыянальная і сусветная культура», «Методыка і вопыт», «Калі закончыўся ўрок».

Сярод нашых аўтараў — вядомыя вучоныя з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Балгарыі, Славакіі, Казахстана і нават Кітая. З намі супрацоўнічаюць лепшыя настаўнікі краіны, якім ёсць чым падзяліцца з калегамі на старонках часопіса. У рэдакцыйным партфелі сотні матэрыялаў, і кожны дзень мы атрымліваем усё новыя рукапісы.

Адметнасць «Роднага слова» яшчэ і ў тым, што гэта адзіны ў краіне беларускамоўны навуковы і метадычны часопіс, які мае чатыры навуковыя спецыяльнасці (філалогія, педагогіка, культуралогія, мастацтвазнаўства) і адносіцца да ліку рэцэнзаваных выданняў Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь. Яго матэрыялы адрасаваны як настаўнікам, выкладчыкам, студэнтам, так і культуролагам, мастацтвазнаўцам, педагогам, а таксама ўсім тым, хто шануе роднае беларускае слова. Трэба адзначыць, што ў пэўнай ступені часопіс рыхтуе маладую навуковую эліту краіны.

— Як вы лічыце, у чым прынцыповае адрозненне часопіса «Роднае слова» ад часопіса «Беларуская мова і літаратура»?

— Гэтае пытанне можна пачуць даволі часта. На першы погляд, асабліва людзям недасведчаным, можа здавацца, што часопісы дублюючь адзін аднаго. Аднак гэта не так. Кожны з часопісаў адметны па-свойму.

Разам з галоўным рэдактарам часопіса «Беларуская мова і літаратура», прафесарам Алесем Іванавічам Бельскім мы робім агульную важную справу на карысць нацыянальнай адукацыі. Гэта вялікае дасягненне, у першую чаргу для настаўнікаў роднай мовы, мець два такія неабходныя і разнапланавыя беларускамоўныя прафесійныя выданні. «Беларуская мова і літаратура» — гэта найбагацейшая метадычная скарбонка, якая дапамагае педагогам якасна, на высокім узроўні арганізаваць актыўную пазнавальную дзейнасць на ўроку, абменьвацца вопытам з калегамі, быць своечасова інфармаванымі па важнейшых пытаннях выкладання прадмета.

«Роднае слова» як навуковае і метадычнае выданне скіравана найперш на асвятленне праблем і перспектыў філалагічнай, культуралагічнай, мастацтвазнаўчай і педагагічнай адукацыі ў рэспубліцы і за яе межамі; прапаганду і папулярызацыю практыкі выхавання і навучання школьнай і студэнцкай моладзі, лепшых здабыткаў нацыянальнай і сусветнай літаратуры, культуры, мастацтва.

Таму я цвёрда пераканана, што гэтыя два часопісы, якія ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго і дапамагаюць педагогам павышаць узровень самаадукацыі не толькі метадычна, але і навукова, павінны займаць адно з самых асноўных месцаў на палічках бібліятэк установаў адукацыі.

— Якім вы бачыце свайго чытача, так бы мовіць, яго партрэт?

— Сярод нашых чытачоў людзі розныя па ўзросце, сацыяльным статусе і прафесіі. Гэта не адны філолагі (*усміхаецца.*), як можа падацца на першы погляд.

Як нашы паважаныя аўтары, так і чытачы — людзі дасведчаныя, адукаваныя, якія цікавяцца навуковымі і архіўнымі матэрыяламі, шануюць беларускае слова і адносяцца да яго як да найвялікшай каштоўнасці ў жыцці.

І я гавару зараз не толькі пра настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, культуролагаў і мастацтвазнаўцаў. Чытацкая катэгорыя выдання даволі розная. Часопіс чытаюць і выпісваюць студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі банкаў, вайскоўцы, людзі з медыцынскай адукацыяй; сем'і, якія вывучаюць новую рэдакцыю беларускага правапісу менавіта па нашым часопісе; сем'і, якія пачалі займацца даследаваннем уласнага роду...

Гэта нас вельмі радуе. Безумоўна, хацелася б бачыць сярод нашых чытачоў і падпісчыкаў больш настаўнікаў роднай мовы, бо апошнім часам стан ведамаснай падпіскі выклікае пэўную заклапочанасць. Мы праводзім асветніцкую працу сярод студэнтаў, выкладчыкаў, настаўнікаў роднай мовы, бяром удзел у канферэнцыях, семінарах, фестывалях, пасяджэннях «круглых сталоў».

У Год кнігі толькі ў студзені і лютым рэдакцыяй часопіса «Роднае слова» праведзены тэматычныя сустрэчы з кіраўнікамі метадычных аб'яднанняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры агульнаадукацыйных устаноў Заводскага, Фрунзенскага, Ленінскага, Маскоўскага, Савецкага, Першамайскага, Кастрычніцкага, Партызанскага і Цэнтральнага раёнаў г. Мінска. Думаецца, сяброў і прыхільнікаў нашага выдання стане больш, а ў часопісе з'явяцца новыя матэрыялы настаўнікаў сталіцы.

— Летась дзякуючы намаганням часопіса «Роднае слова» ў свет выйшаў першы том з серыі кніг пра старажытныя беларускія роды. Распавядзіце крыху падрабязней пра гэты праект.

— Два гады таму мы атрымалі ліцэнзію Міністэрства інфармацыі на выдавецкую дзейнасць. І ўжо ў верасні 2011 г. была падрыхтавана першая кніга з серыі пра старажытныя беларускія роды «Я — сын Ваш: Летапіс беларускай шляхты» аўтара Анатоля Васільевіча Статкевіча-Чабаганава. Першы том «Статкевічы, Сацкевічы-Статкевічы герба «Касцеша». Карафа-Кобруты герба «Корчак»» выйшаў на 592 старонках. Кніга выклікала цікавасць у чытачоў і крытыкаў і была распаўсюджана ў бібліятэкі розных краін свету: Прэзідэнцкую бібліятэку Рэспублікі Беларусь, Нацыянальную бібліятэку Беларусі, Цэнтральную навуковую бібліятэку імя Я. Коласа НАН Беларусі, абласныя і цэнтральныя раённыя бібліятэкі краіны, Расійскую нацыянальную бібліятэку (г. Санкт-Пецярбург), Расійскую дзяржаўную бібліятэку (г. Масква), Дзяржаўную публічную гістарычную бібліятэку Расіі (г. Масква), Нацыянальныя бібліятэкі Літвы, Польшчы, Чэхіі, Балгарыі, Славеніі, Сербіі, Славакіі, Венгрыі і іншыя.

Кнігі вышэйназванай серыі ілюстраваны шматлікімі копіямі гістарычных дакументаў, фотаздымкамі і іншымі матэрыяламі. У іх прадстаўлена апісанне кожнага роду, гісторыі з жыцця яго прадстаўнікоў і радаводныя роспісы за пяцьсот і больш гадоў. Зараз нашым выдавецвам практычна завершана праца над чарговым томам А. Статкевіча-Чабаганава «Некрашэвічы герба «Любіч». Татуры герба «Данброва». Сеўрукі герба «Курч». Кернажыцкія герба «Юноша». Маствіловічы герба «Даленга», а таксама выдадзена кніга Міколы Труса «Янка Купала ў Славакіі».

— Чым яшчэ плануе здзіўляць часопіс «Роднае слова» ў 2012 годзе?

— Сёлета часопіс у другі раз стаў лаўрэатам конкурсу «Залатая Літара» ў намінацыі «Лепшыя матэрыялы навуковай і навукова-папулярнай тэматыкі».

З мая 2012 г. часопіс «Роднае слова» абвешчаны пляцоўкай для развіцця інстытута крытыкі ў краіне. Разам з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь адным з заснавальнікаў часопіса стала грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі». У красавіку ў часопісе адбылася прэм'ера рубрыкі «Беларуская літаратура XXI стагоддзя», якая дапаможа настаўнікам беларускай мовы і літаратуры сістэмна ўбачыць праблематыку сучаснай паэзіі, прозы, драматургіі, пазнаёміцца з новымі імёнамі беларускіх пісьменнікаў.

«Роднае слова» ўпрыгожылі працы беларускіх мастакоў, аб'яднаныя рубрыкай «Архітэктурная спадчына»: на апошняй вокладцы кожнага нумара чытачы змогуць убачыць шэдэўры нацыянальнага дойлідства, увасобленыя ў творах жывапісу і графікі. У раздзеле «Літаратура і час» працягваем знаёміць чытачоў з літаратурнымі партрэтамі класікаў, архіўнымі знаходкамі, новым прачытаннем спадчыны, помнікамі старажытнай літаратуры, яскравымі імёнамі XXI стагоддзя.

З 2012 г. часопіс «Роднае слова» ўключаны ў міжнародны каталог для падпіскі ў Расіі, Польшчы, Літве, Латвіі, ва Украіне, у Казахстане, Германіі, Венгрыі, Балгарыі, Славакіі, ЗША, Канадзе, што будзе толькі на карысць справе пашырэння, папулярызацыі і зберажэння роднай мовы.

Мы прадоўжылі сумесны праект з Саюзам пісьменнікаў Беларусі. З мэтай падтрымкі адораных навучэнцаў, развіцця іх творчых здольнасцяў і інтэлектуальнага патэнцыялу мы ўжо ў другі раз абвясцілі конкурс навукова-даследчых і творчых прац. Вынікі конкурсу будуць падведзены ў юбілейным нумары «Роднага слова» ў студзені 2013 г.

Пытанні задаваў Ілья ЛАПАТО.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ГОРАЦКАЯ «ПЕРАЗАГРУЗКА»

У раённым цэнтры Горкі, дзе рыхтуюцца прымаць рэспубліканскае свята працаўнікоў вёскі, урачыста адкрыліся чыгуначная станцыя «Пагодзіна», стаматалагічная паліклініка і цэнтральная плошча. Цырымоніі адкрыцця прайшлі з удзелам кіраўніка беларускага ўрада і старшыні арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы да «Дажынак» Міхаіла Мясніковіча.

На абноўленай чыгуначнай станцыі «Пагодзіна» зроблена комплексная рэканструкцыя будынка і добраўпарадкаванне навакольнай тэрыторыі. Цяпер гэта сучасны прыгожы вакзал, сапраўдная візітоўка беларускага горада. Станцыю зрабілі камфортнай для пасажыраў і чыгуначнікаў.

У суботу там адкрыўся і рух хуткаснага дызель-цягніка па маршруце «Пагодзіна-Орша». Высокая хуткасць, 90 камфортных месцаў, сучасны «клімат-кантроль», эканомія часу.

— Безумоўна, такім цягніком народ будзе шырока карыстацца, — не мае сумненняў намеснік старшыні Горацкага райвыканкама Наталля Карнеева. — Таму што гэта танна і хутка: білет каштуе ўсяго каля 9 тысяч рублёў, а шлях да Оршы з Горак без прыпынкаў — менш за гадзіну.

Такім чынам, у сталіцу Беларусі з Горак, з улікам перасадкі ў Оршы, можна трапіць крыху больш чым за тры гадзіны. Гэтая чыгуначная лінія будзе зручная і для студэнцкай моладзі, якая вучыцца ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі.

Другі аб'ект — стаматалагічная паліклініка. Яе будынак з'яўляецца помнікам архітэктуры, які цяпер поўнасцю рэстаўраваны. Але самае лепшае ў паліклініцы — не столькі прыгожыя сцены, колькі самае сучаснае абсталяванне, на якім будуць працаваць вопытныя спецыялісты. Паліклініка разлічана на 160 наведванняў у суткі. Цяпер у Горках стане больш шчаслівых усмешак!

Адкрылася ў Горках і абноўленая цэнтральная плошча, дзе месціцца будынак райвыканкама. Яна ўсё яшчэ афіцыйна носіць імя Леніна, хоць савецкаму помніку ў горадзе знайшлі іншае добрае месца. Паводле інфармацыі мясцовых улад, пасля абмеркавання новай назвы плошчы большасць жыхароў Горак аддае перавагу назве «Цэнтральная», таму што плошча сапраўды знаходзіцца ў цэнтры горада.

Ілона ІВАНОВА.

БАРАВІКІ ПРЫМАЮЦЬ ПА 20-50 ТЫСЯЧ ЗА КІЛАГРАМ

Прадпрыемствы спажывецкай кааперацыі працягваюць актыўную нарыхтоўку яблыкаў. Іх ужо закуплена 62 тысячы тон, або на 40 працэнтаў больш, чым на тую ж дату мінулага года, паведамілі ў Белкаапсаюзе.

Сёння цана за адзін кілаграм яблыкаў так званых таварных гатункаў, якіх ад насельніцтва ўжо нарыхтавана 28 тон, складае 3-5 тысяч рублёў. Ападкі закупліваюцца па 300-500 рублёў за кілаграм. Нарыхтаваныя плады таварных гатункаў найперш ідуць у рознічны гандаль для наступнай рэалізацыі, іншая прадукцыя накіроўваецца на перапрацоўчыя прадпрыемствы.

Працягваецца і нарыхтоўка гародніны: сёлета Белкаапсаюз нарыхтаваў яе ад насельніцтва 5,6 тысячы тон, што ў 1,3 раза больш, чым было летась на той жа перыяд. Цана на агуркі вагаецца ад 2,5 тысячы да 4 тысяч рублёў за кілаграм. Акрамя таго, закуплена 4,1 тысячы тон таматаў, якія зараз прымаюць па 3-5 тысяч рублёў за кілаграм. У «актыве» 4,8 тысячы тон капусты (бяруць па 2,5-3 тысячы рублёў), 39 тон часнаку (прымаюць па 15-20 тысяч рублёў). Грыбоў нарыхтавана 58 тон. Да прыкладу, лісічкі прадпрыемствы спажывецкай кааперацыі набываюць па 15-20 тысяч рублёў за кілаграм, баравікі — ад 20 да 50 тысяч, чырвонагаловікі, абабкі — ад 10 да 15 тысяч рублёў за кілаграм.

ЦЫГАРЭТЫ КРЫХУ «ПРЫБАВЯЦЬ»

З 1 верасня ў краіне павялічваюцца цэны на некаторыя маркі цыгарэт. Рост, у сярэднім, складзе 3-3,5%.

Падаражэе тытунёвая прадукцыя ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» і ААТ «Тытунь-Інвест». Напрыклад, цэны на цыгарэты «Pall Mall», «Monte Carlo» зменяцца з 6 тысяч да 6,2 тысячы рублёў за пачак. Некаторыя іншыя маркі цыгарэт, якія таксама адносяцца да другой цэнавай групы, падаражэюць на 500 рублёў. Змяненне кошту закране і шэраг марак тытунёвых вырабаў трэцяй цэнавай групы. Да прыкладу, шэраг відаў цыгарэт «Camel» (новыя цэны будуць вагацца ад 8,5 тысячы да 9,1 тысячы рублёў за пачак), «Winston», «Lucky Strike» (да 8,5 тысячы рублёў за пачак).

Сяргей РАСОЛЬКА.

АБ'ЯЗДЖАЎ КУРЫЦУ...

У вёсцы Буцілы Лідскага раёна здзейсніў аўтааварыю 18-гадовы юнак, які... аб'язджаў курыцу, паведамляе Гродзенская абласная Дзяржаўтаінспекцыя.

Курыца перабягала дарогу, і, каб не наехаць на яе, кіроўца «Аўдзі» ўзяў улева. Аўтамабіль зламаў драўляную агароджу і ўрэзаўся ў слуп. Напэўна, на сітуацыю паўплывала і нявопытнасць вадзіцеля, які толькі нядаўна атрымаў пасведчанне на права кіравання транспартным сродкам. Сам ён не пацярпеў, а вось яго 13-гадовай сястры спатрэбілася медыцынская дапамога.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

■ У цэнтры ўвагі

НЕ МАНАПОЛІЯ, А БАЛАНС

Што хвалюе жыхароў культурнай сталіцы, высвятляў памочнік Прэзідэнта Беларусі па Мінскай вобласці Мікалай Іванчанка

Памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, галоўны інспектар па Мінскай вобласці Мікалай Іванчанка пабываў у Нясвіжскім раёне, дзе сустрэўся з калектывамі цэнтральнай раённай бальніцы і завода медпрэпаратаў.

Гэта адно з чатырох буйных прадпрыемстваў Нясвіжчыны, якое выпускае ў асноўным інфузійныя растворы. На заводзе няпростае фінансавае становішча, невялікія заробкі. І прыезд чыноўніка такога рангу пойдзе толькі на карысць завадчанам. Мікалай Іванчанка абмяркуе сітуацыю, што тут склалася, а таксама планы па стварэнні вытворчасці плазмы крыві і мадэрнізацыі завода з міністрам аховы здароўя. Справа ў тым, што ў раёне ёсць яшчэ адно прадпрыемства, якое выпускае аналагічную прадукцыю медыцынскага прызначэння.

— Манапалізаваць гэты кірунак дзейнасці, відаць, будзе няправільна. Галоўнае, каб, па магчымасці, у далейшым у развіцці двух прадпрыемстваў быў вызначаны баланс. Каб тут не захапіліся імкненнем да інвестыцый, забыўшы пра самае галоўнае — людзей, — падкрэсліў Мікалай Іванчанка. — Трэба імкнуцца да таго, каб прадукцыя была канкурэнтаздольнай, экспартаарыентаванай, а сацыяльны аспект ішоў напарадзе камерцыйнага. Таму варта ўсё ўважліва прааналізаваць, ацаніць і не прымаць імгненных рашэнняў.

Мікалай Іванчанка запэўніў, што заводу медпрэпаратаў будзе надавацца ўвага яшчэ і таму, што сёння ў краіне робіцца стаўка на развіццё сельскіх рэгіёнаў, а Нясвіж, акрамя ўсяго, з'яўляецца і культурнай сталіцай Беларусі. І горад павінен адпавядаць гэтаму статусу ва ўсім: у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, медыцыне, сацыяльна-бытавой сферы.

Апошнім часам у Нясвіжы шмат увагі надаецца развіццю рэгіёна, стварэнню належных умоў жыцця, працы, адпачынку насельніцтва.

— Мы імкнёмся развіваць населеныя пункты, дзе пражывае больш за 4 тысячы чалавек (такія, як Сноў, Гарадзея), так бы мовіць, у роўных прапорцыях. І гэтыя пасёлкі не ўступаюць райцэнтру: тут з'явіліся новыя амбулаторыі, басейны, — канстатаваў старшыня Нясвіжскага райвыканкама Іван Крупко.

Шмат змен адбылося і ў самім горадзе. Адкрыты новыя кавярні, стаянкі, гасцініцы, рэканструюцца паркі. Але з цягам часу павінна быць зроблена яшчэ больш. У чацвёртым квартале пачынаецца будаўніцтва радзільнага дома на 35 месцаў, падрыхтавана дакументацыя па рэканструкцыі і пашырэнні да 600 месцаў старога Дома культуры.

Апошнія два гады ў рэгіёне ўвялі ў эксплуатацыю 31 тысячу квадратных метраў жылля. Сёлета, нягледзячы на тое, што зменшылася крэдытаванне, пры гадавым заданні ў 10 тысяч квадратных метраў ужо пабудавалі 10,5 тысячы, а да канца года будзе ўзведзена 14 тысяч квадратных метраў. У адным з мікрараёнаў адвялі пляцоўку для індывідуальнай забудовы на 340 участкаў. У парадку чаргі тут могуць атрымаць надзелы для будаўніцтва ўсе, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. «Сёлета заканчваем работы па асвятленні вуліц, добраўпарадкаванні дарог. Да канца 2015 года падвядзём прыродны газ. За кошт гэтага блакітнае паліва паступіць і ў бліжэйшыя населеныя пункты», — падзяліўся планамі Іван Крупко.

Пра змены, якія адбываюцца ў горадзе і раёне, добра ведаюць нясвіжане. Але іх хвалюе і добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, будаўніцтва дзіцячых кавярняў і пляцовак. Як зазначыў старшыня райвыканкама, дзве гульнявыя пляцоўкі ўжо зроблены, заканчваецца абсталяванне яшчэ адной. А ў перспектыве на тэрыторыі былой воінскай часці мяркуецца ўзвесці вялікі комплекс, дзе будуць і месцы адпачынку для дзяцей, і аўтастаянкі, і кропкі грамадскага харчавання, і боўлінг, і забаўляльныя аб'екты. Што датычыцца санвузлоў на аўтавакзале, то яны будуць прыведзены ў належны стан (пра будаўніцтва новых гаворка пакуль не ідзе). Плануецца рэканструкцыя старога будынка вакзала — яна ўключае і абсталяванне новых санітарна-гігіенічных месцаў унутры.

Так, пытанні ёсць, але не ўсё адразу магчыма вырашыць. У раёне ўскладаюць надзеі на аддачу ад будаўніцтва новых прадпрыемстваў — з іх з'яўленнем больш сродкаў будзе паступаць у мясцовы бюджэт. А гэта значыць, што з'явяцца новыя магчымасці для развіцця тэрыторыі горада і раёна.

Разам з тым, заўважыў Мікалай Іванчанка, самі жыхары павінны таксама падтрымліваць у належным стане двары, пад'езды, тэрыторыі вакол індывідуальных забудоў. Толькі дзякуючы агульным намаганням улады і насельніцтва горад стане яшчэ больш прыгожым і ўтульным.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■

ЭЛЕКТРОННЫЯ ПРАЯЗНЫЯ БУДУЦЬ УКАРАНЁНЫ Ў МІНСКІМ МЕТРО ЎЖО СЁЛЕТА

Пра гэта паведаміў дырэктар ГУ «Сталічны транспарт і сувязь» Валерый Шкуратаў.

Ён нагадаў, што сёння ў горадзе рэалізуецца праграма па аптымізацыі сістэмы аплаты праезду ў грамадскім транспарце і ўкараненні электронных праязных, першы этап якой і будзе рэалізаваны ў метрапалітэне.

Пасажыр зможа набыць праязны квіток на некалькі паездак — 10, 15, 20 і гэтак далей. Адмысловыя прылады будуць рэгістраваць пасажыраў, якія ўваходзяць, і спісваць з электроннага праязнога грашовы рэсурс. На кожнай станцыі будуць стаяць касы папаўнення рахунку. Кожны пасажыр зможа сам у аўтаматычным рэжыме папоўніць свой праязны квіток. Гэтыя ж апараты будуць паказваць, колькі грошай засталося на картцы для аплаты праезду.

У 2013 годзе сістэму электронных праязных плануецца ўкараніць і на наземным пасажырскім транспарце.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, *«Мінск—Навіны».*

■ Акцэнты

БІТВА ЗА АСАНЖА

ЛЁС заснавальніка WikiLeaks грамадзяніна Аўстраліі Джуліяна Асанжа служыць бліскучай ілюстрацыяй ідэалагічнай бітвы, якая вядзецца на глабальных прасторах. Ці можа адзін адважны чалавек беспакарана кінуць выклік самай магутнай краіне свету — ЗША і іх саюзнікам, апублікаваўшы ў інтэрнэце іх таямніцы? У краін Захаду рэакцыя адназначная: гэта недапушчальна, Асанж павінен панесці суровае пакаранне.

Развіццё падзей вакол фігуры Асанжа прывяло да міжнароднага супрацьстаяння Паўднёвай Амерыкі і Вялікабрытаніі. Нагадаем, што брытанскі ўрад вырашыў выдаць Асанжа ў Швецыю, дзе супраць яго заведзена крымінальная справа аб згвалтаванні. Сам Асанж і многія яго прыхільнікі называюць гэту справу помстай ЗША за распаўсюджванне праз WikiLeaks неафіцыйнай інфармацыі аб дзейнасці амерыканскіх ваенных і дыпламатаў, якія добра падсапсавалі імідж амерыканцаў у свеце. Не сакрэт, што ЗША хацелі б паквітацца з Асанжам, а Швецыя можа аказаць амерыканцам садзейнічанне ў гэтым. Ратуючыся ад такой перспектывы, Асанж схаваўся на тэрыторыі пасольства Эквадора ў Лондане. І вось тут Вялікабрытанія ўсхадзілася, прадэманстраваўшы, што страта Брытанскай імперыі не пазбавіла Лондан імперскіх замашак. У адрас Эквадора пачуліся пагрозы аб магчымасці пазбаўлення яго пасольства дыпламатычнага статусу, што знаходзіцца ў відавочнай супярэчнасці з нормамі міжнароднай дыпламатыі, замацаванымі Венскай канвенцыяй. А калі Эквадор афіцыйна даў Асанжу палітычнае прыстанішча, улады Вялікабрытаніі заявілі, што Асанж не зможа выехаць з краіны ў Эквадор. Саюз паўднёваамерыканскіх нацый 19 жніўня падтрымаў рашэнне Эквадора аб прадастаўленні прыстанішча Асанжу і заклікаў да адмовы ад пагроз. Рэпутацыя Вялікабрытаніі ў Паўднёвай Амерыцы і так надзвычай сапсаваная з-за Фалклендскіх астравоў, захопленых брытанцамі, якія паўднёваамерыканскія нацыі лічаць прыналежнымі да Аргенціны. Напышлівае стаўленне Лондана да суверэннага права Эквадора даваць палітычнае прыстанішча або валодаць суверэнітэтам на тэрыторыі свайго ўласнага пасольства яшчэ больш раззлавала ганарлівых паўднёваамерыканцаў. Вельмі негатыўна паставіўся да нападак на суверэнныя правы Эквадора і харызматычны венесуэльскі лідар Уга Чавес, які перасцярог Вялікабрытанію ад пагражальных ёй непрыемнасцяў пры захаванні такога падыходу.

Не ўтрымалася ад асуджэння заяў брытанскага боку і расійскае МЗС, якое нагадала, што Вялікабрытанія адмаўляецца выдаваць дзясяткі сапраўдных злачынцаў, у тым ліку тых, супраць якіх на радзіме заведзены справы аб цяжкіх злачынствах.

З афіцыйным Лонданам у Расіі свае рахункі. Акрамя надзейнага ўкрыцця ад расійскага правасуддзя злачынцаў, Вялікабрытанія заўсёды актыўна ўмешваецца ва ўнутраныя справы Расійскай Федэрацыі. У 1990-х гадах Лондан быў у першых шэрагах заходніх дзяржаў па падтрымцы ідэі аб аддзяленні Чачні ад Расіі, але пры гэтым нічога не хацеў чуць аб тым, што брытанская Паўночная Ірландыя неяк ненатуральна выглядае на карце астраўной суверэннай ірландскай дзяржавы. А чаго вартая справа з закрыццём у Расіі шматлікіх аддзяленняў Брытанскага Савета, якія адкрываліся на тэрыторыі краіны нелегальна, не плацілі падаткаў і з'яўляліся базай для ўсіх незадаволеных расійскай уладай і, паводле меркавання расійскіх спецслужбаў, брытанскай разведкі. Пасля рашэння Масквы іх закрыць Лондан разгарнуў агульнасусветную кампанію супраць Расіі, вінавацячы яе ў барацьбе са спробай садзейнічання гуманітарнаму прагрэсу пры дапамозе аддзяленняў Брытанскага Савета. Пазіцыя Лондана таксама ўваходзіла ў супярэчнасць з суверэнным правам Расійскай Федэрацыі адкрываць і закрываць на сваёй тэрыторыі любыя падраздзяленні гуманітарных замежных арганізацый, што сведчыла аб уяўленні брытанскага боку: Расія не павінна валодаць поўным суверэнітэтам на сваёй уласнай тэрыторыі.

ЗША і Вялікабрытанія аказаліся ў няпростай сітуацыі. Паляванне на Асанжа дорага абыходзіцца для старанна ствараемага іміджу галоўных абаронцаў правоў чалавека і дэмакратыі ва ўсім свеце. Вядома, гэты імідж значна пацьмянеў пасля апублікаваных Асанжам фактаў забойства мірных жыхароў і рэпарцёраў ваеннымі НАТА ў Афганістане і дзейнасці пасольстваў заходніх краін па стварэнні сеткі тайных інфарматараў і агентаў па ўсім свеце. Паляванне на Асанжа даводзіцца весці ў няпростай сітуацыі, калі нават заходнія СМІ адмаўляюцца верыць у яго вінаватасць. Кожны рэдактар або журналіст у заходніх газетах або на тэлебачанні лёгка можа ўявіць сябе на месцы Асанжа — апынуцца ў ролі абвінавачванага па крымінальнай справе ў адказ на апублікаванне фактаў аб заходнім свеце, якія не варта было выкрываць. І ім гэта, вядома, не можа спадабацца. Грамадская думка, у тым ліку ў саміх заходніх краінах, таксама знаходзіцца на баку Асанжа. Людзі лічаць, што з самага пачатку павінны былі ведаць пра ўсе непрывабныя факты дзейнасці сваіх урадаў, пра якія даведаліся толькі дзякуючы дзейнасці Асанжа, і лічаць, што ў будучыні ўрады будуць паводзіць сябе больш стрымана, улічваючы магчымасць новага выкрыцця.

Сяргей КІЗІМА,
загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук

■

РЭТРА-ПАЦАЛУНАК

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ШКОЛА ІМЯ НАСТАЎНІКА

Бялыніцкай школе № 1 прысвоена імя Мікалая Пашкоўскага, які выкладаў тут фізіку і быў яе дырэктарам, а потым узначаліў раённы аддзел адукацыі.

— Ужо год, як Мікалая Іванавіча не стала, — расказала дырэктар школы № 1 Бялынічаў Таццяна Балдышэўская. — Але ўсе мы памятаем, як ён быў адданы сваёй працы і вёў усіх за сабой, да поспехаў. Самае галоўнае, што яго, настаўніка, вельмі любілі дзеці. Ён быў сур'ёзным і патрабавальным, але, разам з тым, добрым і справядлівым чалавекам. Заўсёды вучыў нас успрымаць вучняў і іх бацькоў на роўных, знаходзіць паразуменне.

У гонар падзеі ў школе адкрыўся пераабсталяваны клас фізікі, у якім выкладаў Мікалай Пашкоўскі.

Ілона ІВАНОВА.